www.gazeta.bsu.by

# УНІВЕРСІТЭТ

Газета Беларускага дзяржаўнага універсітэта

23 лютага 2006 года, № 4 (1934)

### СЁННЯ — ДЗЕНЬ АБАРОНЦАЎ АЙЧЫНЫ І УЗБРОЕНЫХ СІЛ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

## СА СВЯТАМ!



*Напярэдадні Дня абаронцаў Айчыны мы сустрэліся з курсантам ваеннага факультэта першага года навучання Алегам Нарчуком. Будучы вайсковец атрымлівае адукацыю на юрыдычным факультэце па спецыяльнасці правазнаўства.*

*Штрыхі да партрэта: скончыў суворaўскае вучылішча з залатым медалём, актывіст, спартсмен, выдатнік вучобы.*

**— Што б вы пажадалі моцнай палове прадстаўнікоў БДУ ў гэты святочны дзень?**

— Удзельнікам і ветэранам войнаў — перш-наперш здароўя. Курсантам — поспехаў у ваеннай справе і выдатнай вучобы.

**— Якія цяжкасці ў курсантаў?**

— Галоўная праблема — недахоп часу. Гэта выклікана аддаленасцю навучальнага корпуса ад казармы. На жаль, у жыцці юрфака не атрымліваецца ўдзельнічаць: мы празмерна занятыя, у нас строгі распарадак дня.

**— Чым плануеце займацца ў далейшым?**

— Ведаеце, беларускія Узброеныя Сілы больш законапаслухмяныя ў параўнанні з расійскімі. У нас нават збіраюцца расфарміроўваць дысбат у Масюкоўшчыне з-за мізэрнай колькасці злачынцаў! І я планую павышаць законапаслухмянасць сярод ваеннаслужачых.

**Ала МАЧАЛАВА, фота Юліі ПАПОВАЙ**

### ПАДЗЕІ

## ГОЛАС УНІВЕРСІТЭТА НА УСЕБЕЛАРУСКІМ СХОДЗЕ

*На III Усебеларускім сходзе, які пройдзе 2—3 сакавіка ў Палацы Рэспублікі, БДУ будуць прадстаўляць 4 дэлегаты: рэктар БДУ прафесар Васіль Іванавіч Стражаў, старшыня ГА "Саюз жанчын БДУ" Святлана Рыгораўна Савіна, дэкан факультэта журналістыкі, дацэнт Сяргей Валянцінавіч Дубовік, а таксама студэнтка III курса юрыдычнага факультэта БДУ Людміла Арлоўская.*

Напярэдадні гэтай падзеі мы сустрэліся з Людмілай Арлоўскай — старшынёй студэнцкага савета па якасці адукацыі БДУ.

— Ад гэтага форуму я чакаю адкрытага дыялогу розных слаёў грамадства, — паведаміла дзяўчына. — Гэта выдатная магчымасць абмеркаваць надзённыя праблемы з кіраўніцтвам дзяржавы, прадстаўнікамі дзяржаўных органаў, людзьмі, шырока вядомымі сваімі дасягненнямі не толькі ў краіне, але і за мяжой. Мяне як прадстаўніцу студэнцтва больш за ўсё цікавяць пытанні маладзёжнай палітыкі. Сёння для моладзі Беларусі актуальнымі, сярод іншых, з'яўляюцца пытанні павышэння якасці адукацыі, абмену вопытам, ведамі з прадстаўнікамі ўстаноў адукацыі іншых краін. Моладзь — будучыня Беларусі, менавіта таму, я лічу, мы павінны выказаць свае адносіны да таго, што адбываецца і будзе адбывацца ў роднай краіне!



**Ала МАЧАЛАВА**

## СЁННЯ Ў НУМАРЫ:

### НАШЫ ВУЧОНЫЯ ПАВЫШАЮЦЬ АЎТАРЫТЭТ БДУ І ЎСЁЙ КРАІНЫ

**Інтэрв'ю з першым прарэктарам прафесарам Сяргеем РАХМАНАВЫМ**

Стар. 2

## ДЗЕНЬ ІНФАРМАВАННЯ

У рамках адзінага Дня інфармавання насельніцтва 15 лютага рэктар БДУ прафесар Васіль Стражаў выступіў перад прарэктарамі, дэканамі, іх намеснікамі, прадстаўнікамі студэнцкага актыву БДУ. Тэма яго даклада была "Стратэгічныя прыярытэты і кансалідуючыя ідэі беларускага грамадства". Рэктар расказаў пра поспехі ў сацыяльна-эканамічным развіцці краіны за апошняе дзесяцігоддзе, а таксама пра сённяшні дзень і перспектывы развіцця БДУ.

## ВЕСТКІ З РЭКТАРАТА

Дэлегацыі Іжэўскай сельскагаспадарчай акадэміі і Чалябінскага дзяржаўнага універсітэта наведалі з візітамі БДУ. Яны азнаёміліся з сучаснымі навуковымі распрацоўкамі Белдзяржуніверсітэта, сустрэліся з кіраўніцтвам ВНУ. Падчас перамоваў абмеркаваны перспектывы далейшага двухбаковага супрацоўніцтва.

Перспектывы навучання іракскіх студэнтаў у БДУ абмеркаваны на сустрэчы рэктара БДУ прафесара Васіля Стражава з Надзвычайным і Паўнамоцным Паслом Ірака ў Расіі і Беларусі (па сумяшчальніцтве) Абдуль-Карым Хашым Мастафой.

Прарэктар БДУ Віктар Самахвал у складзе дэлегацыі Міністэрства адукацыі Беларусі наведаў Кітайскую Народную Рэспубліку. Беларуская дэлегацыя была запрошана кітайскім бокам на XI Міжнародны выставачны тур па адукацыі.

Да 85-й гадавіны БДУ мяркуецца выдаць кнігу з серыі "Памяць і слава", якая будзе прысвечана перыяду станаўлення Белдзяржуніверсітэта з 1921 па 1941 гады.

Рэктар БДУ Васіль Стражаў на Вучоным савеце універсітэта прадставіў новага дэкана факультэта філасофіі і сацыяльных навук доктара сацыялагічных навук Анатоля Уладзіміравіча Рубанава.

Адбылося пашыранае пасяджэнне рэктарата, на якім быў прадстаўлены даклад дэкана факультэта журналістыкі Сяргея Дубовіка "Аб стане вучэбнай, ідэалагічнай і выхаваўчай работы на факультэце журналістыкі".

**Паводле інфармацыі прэс-службы БДУ**

### ВЕДАЙ НАШЫХ!

## ЮРЫСТЫ БДУ НА АЛІМПЕ!

*Студэнты юрыдычнага факультэта БДУ занялі першае месца ў камандным і асабістым заліку на II Беларускай студэнцкай юрыдычнай алімпіядзе. Адбылася яна 17—18 лютага на базе юрфака нашага універсітэта.*

"Золата" заваявалі студэнты V курса юрыдычнага факультэта Кірыла Сташкоў, Валерыя Жыгуліч, Ганна Карабельнікава, Надзея Жук, Улляна Карпекіна. Другое месца таксама ў каманды БДУ: Алег Харытонаў, Ксенія Інюткіна, Аляксандр Каласкоў і Юрый Самкоў. Студэнтка V курса Надзея Газдзюк перамагла ў індывідуальным заліку. Другое месца заняў студэнт IV курса Міхаіл Чыкілёў, трэцяе — трэцякурсніца Ірына Галубенка.

У алімпіядзе ўзялі ўдзел 12 камандаў — з БДУ, БДЭУ, Мінскага інстытута кіравання, Міжнароднага інстытута працоўных і сацыяльных адносін, Гомельскага, Брэсцкага, Полацкага і Віцебскага дзяржаўных універсітэтаў, Акадэміі МУС РБ, Беларускай сельскагаспадарчай акадэміі.

**Паводле інфармацыі прэс-службы БДУ**

### АКТУАЛЬНА

## ДОБРАЯ ШКОЛА — ЖУРНАЛІСТУ НА КАРЫСЦЬ

*Журналісты-пачаткоўцы са студэнцкіх выданняў Беларусі сабраліся 17—19 лютага ў САК "Брыганціна". У гэтыя дні тут праходзіў выязны семінар-практыкум "Зімовая школа студэнцкай журналістыкі".*



Школа, арганізатарамі якой выступілі Міністэрства адукацыі, Мінгарвыканкам і БДУ, праводзілася ўжо ў другі раз. Сабраліся каля 200 маладых журналістаў з ВНУ ўсёй краіны. На адкрыцці школы з прывітаннем выступілі начальнік аддзела па справах моладзі Мінгарвыканкама Віталь Брэль, прарэктар па вучэбна-выхаваўчай рабоце і сацыяльных пытаннях БДУ Уладзімір Сувораў, дэкан факультэта журналістыкі Сяргей Дубовік, начальнік упраўлення выхаваўчай работы з моладдзю Павел Скалабан.

Падчас практыкуму была наладжана работа чатырох секцый, на якіх выкладчыкі факультэта журналістыкі, а таксама супрацоўнікі студгарадка БДУ расказвалі пра асаблівасці дызайну газеты, маладзёжнага тэле- і радыёвяшчання, пра Інтэрнэт-СМІ ВНУ, а таксама пра студэнцкія інфармацыйныя службы.

На сустрэчу са студэнтамі завіталі высокія госці. Адбылася прэс-канферэнцыя з удзелам міністра адукацыі Беларусі Аляксандра Радзькова, дэпутата Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Ігара Карпенкі і рэктара БДУ Васіля Стражава. На працягу некалькіх гадзін студэнты распытвалі іх не толькі пра асаблівасці сістэмы адукацыі і новыя праекты, але таксама і пра студэнцкія гады і захапленні.

На працягу двух дзён адбывалася выстава-конкурс малатыражных газет ВНУ, прадстаўнікі якіх прымалі ўдзел у семінары. Самыя адметныя з іх былі ўзнагароджаны дыпломамі і прызамі ў пяці намінацыях. Лепшай газетай ВНУ стаў "Шкаляр", які выдаецца ў БДПУ. Газета "VITA" біяфака БДУ атрымала дыплом як лепшае факультэцкае выданне, а першае месца за дызайн заняла "Обратная связь" Студэнцкага саюза БДУ. За публікацыі на патрыятычную тэматыку было ўзнагароджана выданне "Гродзенскі універсітэт" ГрДУ імя Янкі Купалы, а прыз сімпатый чытачоў дастаўся газеце "Перья" факультэта журналістыкі БДУ.

Акрамя таго, падчас семінара студэнцкія рэдакцыі рыхтавалі насценныя плакаты "За моцную і квітнеючую Беларусь". У ліку пераможцаў — рэдкалегія газеты "Перья" з плакатам "Рамонкавая Беларусь" і газета біяфака БДУ "VITA" за арыгінальны плакат "Квітнеючая Беларусь".

**Аляксандр САЛАМАХІН**
**Фота Юліі ПАПОВАЙ**

*На фота: Міністр адукацыі Аляксандр Радзькоў і рэктар БДУ Васіль Стражаў сярод студэнтаў*

## АФІЦЫЙНА

### ЛЕПШЫХ АДЗНАЧЫЛІ СТЫПЕНДЫЯМІ

*На пасяджэнні Вучонага савета БДУ было прынята рашэнне аб прызначэнні на другі семестр 2005/2006 навучальнага года*

**стыпендый Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь наступным студэнтам:**

Валерыі Жыгуліч — студэнтцы V курса юрыдычнага факультэта;

Вікторыі Лебедзь — студэнтцы III курса ФПМІ;

Таццяне Буранковай — студэнтцы V курса фізічнага факультэта;

Андрэю Андрыеўскаму — студэнту IV курса факультэта радыёфізікі і электронікі;

**стыпендый Нацыянальнага банка РБ наступным студэнтам:**

Святлане Лазук — студэнтцы III курса эканамічнага факультэта;

Таццяне Панкрацьевай — студэнтцы IV курса эканамічнага факультэта;

Крысціне Зубовіч — студэнтцы V курса факультэта міжнародных адносін;

**імянных стыпендый наступным студэнтам:**

**імя Ф. Скарыны**

Аляксандру Кірыльчыку — студэнту V курса юрыдычнага факультэта;

Надзеі Жук — студэнтцы V курса юрыдычнага факультэта;

Кацярыне Макарэвіч — студэнтцы IV курса эканамічнага факультэта;

Віталю Рэпіну — студэнту IV курса гістарычнага факультэта;

Аляксандры Зуевай — студэнтцы V курса гістарычнага факультэта;

Сяргею Сарокіну — студэнту III курса геаграфічнага факультэта;

Кацярыне Скрыган — студэнтцы IV курса біялагічнага факультэта;

Але Казловай — студэнтцы V курса ФФСН;

Кацярыне Данілавай — студэнтцы V курса ФФСН;

Аляксею Гайдуку — студэнту III курса хімічнага факультэта;

Георгію Раіку — студэнту IV курса факультэта радыёфізікі і электронікі;

Паўлу Зязюлю — студэнту III курса факультэта радыёфізікі і электронікі;

Ягору Кішылаву — студэнту V курса ФПМІ;

Аляксандру Іванюку — студэнту III курса ФПМІ;

Інзе Дудко — студэнтцы V курса факультэта міжнародных адносін;

Таццяне Каласоўскай — студэнтцы V курса ФПМІ;

Але Занкавец — студэнтцы V курса філалагічнага факультэта;

**імя М. Багдановіча**

Алене Яско — студэнтцы IV курса факультэта журналістыкі;

**імя П. Броўкі**

Ігару Горскаму — студэнту IV курса факультэта журналістыкі;

**імя Я. Коласа**

Марыне Дварэцкай — студэнтцы III курса філалагічнага факультэта;

**імя Я. Карскага**

Таццяне Жэбіт — студэнтцы III курса філалагічнага факультэта;

**імя Я. Купалы**

Ларысе Крыўко — студэнтцы III курса філалагічнага факультэта;

**імя К. Крапівы**

Веры Белашыцкай — студэнтцы III курса філалагічнага факультэта;

**імя А. Пушкіна**

Марыне Саўко — студэнтцы III курса філалагічнага факультэта;

**імя Ф. Фёдарава**

Аляксандру Лявонаву — студэнту V курса фізічнага факультэта;

**імя А. Сеўчанкі**

Таццяне Габрусевай — студэнтцы IV курса фізічнага факультэта;

Леаніду Краўцэвічу — студэнту III курса факультэта радыёфізікі і электронікі;

**імя М. Танка**

Вользе Качатковай — студэнтцы V курса філалагічнага факультэта;

**імя А. Гурыновіча**

Надзеі Сліве — студэнтцы III курса факультэта міжнародных адносін;

**імя А. Грамыкі**

Дзмітрыю Жылко — студэнту V курса факультэта міжнародных адносін.

**С.К. РАХМАНАЎ:** — З ПЕРШЫХ КРЫНІЦ

# "НАШЫ ВУЧОНЫЯ ПАВЫШАЮЦЬ АЎТАРЫТЭТ БДУ І ЎСЁЙ КРАІНЫ"

*10 лютага ў нашым універсітэце адбылося пасяджэнне Вучонага савета, на якім былі падведзены вынікі навукова-даследчай і навукова-інавацыйнай дзейнасці БДУ за 2005 год. Пра тое, чым жыве універсітэцкая навука сёння, якія яе асноўныя дасягненні і перспектывы, з якімі праблемамі сутыкаюцца нашы навукоўцы, расказвае першы прарэктар, прафесар Сяргей Кімавіч РАХМАНАЎ:*



— Наш універсітэт — адзін з вядучых навуковых цэнтраў краіны і ў многім з'яўляецца безумоўным лідэрам. Гэта тычыцца і

**ФІНАНСАВАННЕ НАВУКОВАЙ І НАВУКОВА-ТЭХНІЧНАЙ СФЕРЫ КОМПЛЕКСУ БДУ З ДЗЯРЖБЮДЖЭТУ**
(у млн дол. ЗША)




**ДП, ДНТП, ГНТП, ІП уласнымі сіламі, іншыя бюджэтныя дагаворы**

сістэмы падрыхтоўкі кадраў вышэйшай кваліфікацыі, і ўдзелу універсітэта ў важнейшых дзяржаўных праграмах навуковых даследаванняў, і вынікаў практычнай дзейнасці навукоўцаў у інтарэсах эканомікі краіны, і вынікаў міжнароднай навукова-тэхнічнай дзейнасці. Я лічу, што нашы вучоныя павышаюць аўтарытэт не толькі БДУ, але і ўсёй краіны.

Пацвярджае гэта вялікая колькасць узнагарод Белдзяржуніверсітэта на міжнародных выставах, а таксама значная колькасць кантрактаў, праз якія ідзе вялікі аб'ём фінансавання. Важна, што студэнты (а гэта будучыя выкладчыкі, навукоўцы) маюць вельмі высокі ўзровень падрыхтоўкі і рэгулярна становяцца пераможцамі міжнародных алімпіяд па матэматыцы, фізіцы, хіміі, біялогіі. Гэта дазваляе універсітэту разлічваць і на далейшае развіццё ў навуковай сферы.

**— А што можна сказаць пра фінансавае забеспячэнне навуковай сферы універсітэта?**

**Колькасць абарон дысертацый аспірантамі БДУ ў тэрмін па навуковых кірунках і падраздзяленнях БДУ за 2005 г.**

| Навуковы кірунак | Падраздзяленне | Колькасць і % аспірантаў, якія абараніліся ў тэрмін | |
|---|---|---|---|
| Фізіка | ФРФіЭ | 2 | 33,3 |
| Матэматыка | Мехмат<br>ФПМІ | 1<br>2 | 11,1<br>20,0 |
| Хімія | Хімфак, НДІ ФХП | 4 | 24,0 |
| Біялогія | Біяфак | 2 | 20,0 |
| Філалогія | Філфак | 4 | 19,0 |
| Філасофія, сацыялогія | ФФСН, РІВШ | 3 | 9,1 |
| Эканоміка | Эканамфак | 1 | 9,1 |
| Юрыспрудэнцыя, паліталогія | Юрфак | 1 | 4,8 |
| Міжнародныя адносіны | ФМА | 4 | 25,0 |
| Геаграфія, журналістыка, гісторыя, педагогіка | Геафак, журфак, гістфак, каф.педагогікі | 0 | 0 |
| | УСЯГО | 24 | Ср. %=11,5 |

— На сённяшні дзень навуковая сфера краіны ў цэлым, у тым ліку і універсітэта, фінансуецца стабільна і на дастаткова высокім узроўні. Зразумела, кіраўніцтва Беларусі імкнецца больш эфектыўна выкарыстоўваць сродкі, якія выдаткоўваюцца на навуку: з разлікам найперш на канкрэтны эканамічны вынік. Таму і ва універсітэце мы стараемся арыентаваць вынікі навуковых даследаванняў на практыку, на інтарэсы эканомікі.

Кіраўніцтва універсітэта разумее: каб палепшыць фінансаванне навукі, трэба шукаць і пазабюджэтныя крыніцы. Мы разлічваем, што ў бліжэйшыя 5 гадоў зможам значна павялічыць аб'ём рэалізацыі нашай навукова-тэхнічнай прадукцыі як на ўнутраным рынку, так і на знешніх. Варта адзначыць, што БДУ пастаўляе сваю навукова-тэхнічную прадукцыю больш чым у 20 краін свету.

**— Які стан і перспектывы развіцця сістэмы падрыхтоўкі кадраў вышэйшай кваліфікацыі ў БДУ?**

— На цяперашні час эфектыўнасць працы аспірантуры ў БДУ — максімальная для буйных навуковых цэнтраў краіны: абараняецца 60—70 кандыдацкіх і 15—17 доктарскіх дысертацый у год, каля 15 % выпускнікоў аспірантуры абараняецца ў тэрмін, у той час калі ў астатніх вядучых навуковых цэнтрах краіны гэты працэнт значна ніжэйшы. Аднак для БДУ гэта недастаткова. Каб дасягнуць лепшых вынікаў, неабходна больш уважліва адбіраць саіскальнікаў, больш патрабавальна ставіцца да навуковай працы аспірантаў.

Універсітэт рыхтуе кадры вышэйшай кваліфікацыі для ўсёй краіны: напрыклад, да 80—90 аспірантаў у год навучаецца ў БДУ па мэтавым наборы. Каб павысіць эфектыўнасць гэтай працы, неабходна агульнадзяржаўная каардынацыя, што дазволіла б супрацоўнічаць не толькі з ВНУ, але і рознымі галінамі эканомікі.

**Кадравы патэнцыял БДУ**
(штатныя супрацоўнікі, па стане на 1 студзеня 2006 года)

| | |
|---|---|
| Агульная колькасць супрацоўнікаў | 7642 |
| Прафесарска-выкладчыцкі састаў | 2335 |
| Навуковыя работнікі (даследчыкі) | 860 |
| Дактары навук | 274 |
| Кандыдаты навук | 1329 |

**— Што робіць універсітэцкая навука для ўдасканальвання сістэмы адукацыі?**

— Студэнты з першых курсаў не толькі вывучаюць адпаведныя дысцыпліны на лекцыях, семінарах, лабараторных занятках, але і займаюцца канкрэтнымі навуковымі даследаваннямі ў лабараторыях універсітэта — іх у нас больш за 100. У рамках фінансавання, якое мы атрымліваем на фундаментальныя даследаванні, арганізавана сістэма грантаў, якая дазваляе фінансаваць асобныя праекты студэнтаў і аспірантаў, — дадатковая магчымасць матэрыяльнай падтрымкі універсітэцкай адукацыі.

Большасць нашых вядучых навукоўцаў непасрэдна ўдзельнічае ў навучальным працэсе: лекцыі, лабараторныя работы, семінарскія заняткі і г.д. Навучальныя курсы пастаянна абнаўляюцца, і студэнты атрымліваюць самыя сучасныя веды, якія часам не ўдаецца знайсці ў падручніках.

**— Якая роля міждысцыплінарных даследаванняў увогуле і ў навуковай сферы універсітэта ў святле сусветных тэндэнцый развіцця навукі?**

**Колькасць студэнтаў, якія ўдзельнічаюць у разнастайных формах НДР**

| год | 2001 | 2002 | 2003 | 2004 | 2005 | Всего |
|---|---|---|---|---|---|---|
| НДРС усяго (чал.) | 2885 | 3445 | 3587 | 3834 | 4177 | 17928 |
| Удзельнічалі ў выкананні планавых дзяржбюджэтных і гасдагаворных НДР | 1017 | 984 | 1046 | 1168 | 1159 | 5374 |
| З іх з аплатай па сумяшчальніцтве | 351 | 376 | 388 | 346 | 300 | 1761 |
| Лаўрэаты спецыяльнага фонду Прэзідэнта РБ | 63 | 43 | 44 | 55 | 61 | 266 |
| Колькасць СНДЛ | 20 | 20 | 20 | 22 | 26 | 26 |
| Колькасць студэнтаў, якія працуюць у СНДЛ | 271 | 424 | 348 | 354 | 417 | 1814 |

— Міждысцыплінарныя даследаванні — сусветная тэндэнцыя. Усе асноўныя адкрыцці, якія робяцца ў апошні час, усе асноўныя кірункі навуковых даследаванняў, якія даюць максімальны эканамічны вынік, — гэта вынікі міждысцыплінарных даследаванняў.

Напрыклад, у Маскоўскім дзяржаўным універсітэце ёсць спецыялізаваныя шматпрофільныя інстытуты: фізіка-хімічнай біялогіі, біяхімічнай фізікі і г.д. Ёсць спецыяльны факультэт навук пра матэрыялы, дзе студэнты атрымліваюць адукацыю не ў адной канкрэтнай галіне (напрыклад, фізіцы або матэматыцы), а ў галіне сплаву навук.

**ВЫДАТКІ НА АБСТАЛЯВАННЕ Ў 2005 ГОДЗЕ**

Балансавы кошт навуковага і навучальнага абсталявання універсітэта па стане на 31 снежня 2005 года складае **51297,3 млн руб.**

**Закупка абсталявання са сродкаў рэспубліканскага бюджэту па раздзеле «Навука» на развіццё МТБ па гадах у тыс. дол. ЗША**




Разам за пастаўленае ў 2005 годзе навуковае абсталяванне оплочана **2313,3 млн руб.:**
- сродкі рэспубліканскага бюджэту па раздзеле «Навука» на развіццё МТБ – **1688,5**
- бюджэтныя сродкі на выкананне НДР – **419,4**
- перададзена на баланс БДУ за кошт іншых сродкаў – **205,4**

У нашым універсітэце таксама ёсць такія прыклады: кафедра біяфізікі на фізічным факультэце, кафедра біяхіміі на біялагічным факультэце, лабараторыя біяхімічных даследаванняў у НДІ фізіка-хімічных праблем. Але гэтага мала. Мяркуем ужо з гэтага года больш актыўна працаваць у гэтым кірунку. Сэнс атрымання такой падрыхтоўкі — у павышэнні канкурэнтаздольнасці нашых спецыялістаў не толькі ў плане адукацыі, але і ў плане канкрэтных навуковых даследаванняў і практычнага прымянення навуковых ведаў.

**— Адна з важных праблем, з якой сутыкаюцца навукоўцы ў сваёй працы, — абарона інтэлектуальнай уласнасці. Як яна вырашаецца ва універсітэце?**

— Вучоны павінен быць упэўненым, што пры ўкараненні распрацоўкі ці тэхналогіі ў практыку ён атрымае адэкватную аплату і яго інтэлектуальная ўласнасць будзе абароненая. Пакуль адпаведная сістэма ў краіне яшчэ цалкам не сфарміравалася.

**Сярэдні ўзровень заработнай платы штатных навуковых супрацоўнікаў БДУ у дол. ЗША (без уліку адміністрацыйных работнікаў)**




У нашым універсітэце вядзецца актыўная праца па стварэнні сістэмы абароны інтэлектуальнай уласнасці, якая дазволіць прыцягнуць да гэтай працы вядучых спецыялістаў у гэтай сферы. Спадзяюся, што такая сістэма пры падтрымцы Дзяржаўнага камітэта па навуцы і тэхналогіях Рэспублікі Беларусь будзе сфарміравана ў бліжэйшыя месяцы.

**Гутарыла Таццяна КАЗАК**
**Фота Юліі ПАПОВАЙ**

# 19 САКАВІКА — ВЫБАРЫ ПРЭЗІДЭНТА РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

## ВЫТРЫМКІ З ВЫБАРЧАГА КОДЭКСУ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

Выбары Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь (...)* з'яўляюцца свабоднымі і праводзяцца на аснове ўсеагульнага, роўнага і прамога выбарчага права пры тайным галасаванні. (Арт. 3)

Выбары Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь (...) з'яўляюцца ўсеагульнымі: права выбіраць (...) маюць грамадзяне Рэспублікі Беларусь, якія дасягнулі 18 гадоў. (Арт. 4)

Выбары Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь (...) з'яўляюцца свабоднымі: выбаршчык (...) асабіста вырашае, ці ўдзельнічаць яму ў выбарах (...), за каго галасаваць на выбарах (...) (Арт. 5)

Выбаршчыкі (...) удзельнічаюць адпаведна ў выбарах Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь (...) на роўных падставах: кожны выбаршчык (...) мае адзін голас. (Арт. 6)

Выбары Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь (...) з'яўляюцца прамымі. Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь выбіраецца непасрэдна народам Рэспублікі Беларусь. (Арт. 7)

Галасаванне на выбарах (...) з'яўляецца тайным: кантроль за волевыяўленнем выбаршчыкаў (...) у ходзе галасавання забараняецца. (Арт. 9)

Правядзенне выбараў Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь (...) забяспечваюць камісіі, якія ўтвараюцца з прадстаўнікоў палітычных партый, іншых грамадскіх аб'яднанняў, працоўных калектываў, а таксама прадстаўнікоў грамадзян, вылучаных у склад камісіі шляхам падачы заявы. Камісіі ажыццяўляюць кантроль за выкананнем заканадаўства аб выбарах (...). (Арт. 11)

Падрыхтоўка і правядзенне выбараў Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь (...) ажыццяўляюцца адкрыта і галосна. (Арт. 13)

Пры выбарах Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь (...) галасаванне праводзіцца з 8 да 20 гадзін. Аб часе і месцы галасавання ўчастковыя камісіі апавяшчаюць выбаршчыкаў (...) не пазней чым за 10 дзён да выбараў (...). (Арт. 50)

Кожны выбаршчык (...) галасуе асабіста, галасаванне за іншых асоб не дапускаецца.

Бюлетэнь для галасавання выдаецца выбаршчыку (...) пад роспіс членам участковай камісіі на падставе спіса грамадзян, якія маюць права ўдзельнічаць у выбарах (...) пасля прад'яўлення пашпарта або пасведчання асобы, якое яго замяняе.

Бюлетэнь запаўняецца галасуючым у кабіне або пакоі для тайнага галасавання. Пры запаўненні бюлетэня забараняецца прысутнасць каго б там ні было, акрамя галасуючага.

Пры галасаванні на выбарах выбаршчык ставіць любы знак у пустым квадраце, размешчаным справа ад прозвішча таго кандыдата, за якога ён галасуе. Калі выбаршчык галасуе супраць усіх кандыдатаў, ён ставіць любы знак у пустым квадраце, размешчаным справа ад радка "Супраць усіх кандыдатаў".

Запоўнены бюлетэнь выбаршчык (...) апускае ў скрынку для галасавання. (Арт. 52)

Выбаршчык (...), які не мае магчымасці ў дзень выбараў (...) знаходзіцца па месцы свайго жыхарства, мае права не раней чым за пяць дзён да выбараў (...) ва ўмовах, што выключаюць кантроль за яго волевыяўленнем, запоўніць у памяшканні ўчастковай камісіі бюлетэнь і апусціць яго ў апячатаную асобную скрынку для галасавання выбаршчыкаў (...), якія будуць адсутнічаць у дзень правядзення выбараў (...) па месцы іх жыхарства. Афіцыйнага пацвярджэння прычын немагчымасці выбаршчыка (...) прыйсці ў памяшканне для галасавання ў дзень выбараў (...) не патрабуецца.

Датэрміновае галасаванне ажыццяўляецца з 10 да 14 гадзін і з 16 да 19 гадзін у прысутнасці не менш двух членаў участковай камісіі.

Пры атрыманні бюлетэня выбаршчык (...) уласнаручна распісваецца ў спісе грамадзян, якія маюць права ўдзельнічаць у выбарах, (...) і ўказвае дату датэрміновага галасавання. (Арт. 53)




*(...)* — прапушчаны словы, якія не тычацца выбараў Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь*

## УЧАСТКІ ДЛЯ ГАЛАСАВАННЯ ІНШАГАРОДНІХ СТУДЭНТАЎ

■ Інтэрнат № 1 — выбарчы ўчастак № 2 (вул. Свярдлова, 30)

Інтэрнаты № 2, 5, 6, 7 — выбарчы ўчастак № 57 (вул. Кастрычніцкая, 10, інтэрнат № 6)

Інтэрнат № 4 — выбарчы ўчастак № 17 (вул. Ракаўская, 38)

Інтэрнат № 8 — выбарчы ўчастак № 26 (вул. Крапоткіна, 44)

Інтэрнат № 9 — выбарчы ўчастак № 61 (вул. К. Маркса, 31, філалагічны факультэт)

Інтэрнаты № 3, 10 — выбарчы ўчастак № 9 (вул. Курчатава, 8, інтэрнат № 10)

■ Студэнты, прапісаныя па адрасе: прасп. Незалежнасці, 4 (галоўны навучальны корпус БДУ), — выбарчы ўчастак № 13 (вул. Валадарскага, 9).

## ТВОЙ ГОЛАС ПАТРЭБЕН КРАІНЕ!

Лічыцца, што правядзенне выбараў — вельмі важная грамадска-палітычная падзея для кожнай дэмакратычнай краіны. Асабліва, калі гэта выбары кіраўніка дзяржавы. Кожны павінен усведамляць, што мы не проста выбіраем чалавека, які будзе вызначаць дзяржаўную палітыку — мы выбіраем будучы курс развіцця краіны ва ўсіх сферах жыцця грамадства: эканамічнай, палітычнай, сацыяльнай і духоўнай.

Як вядома, 19 сакавіка адбудуцца чарговыя выбары Прэзідэнта Беларусі. І ад нашай актыўнасці ў рэалізацыі канстытуцыйнага права выбіраць кіраўніка сваёй дзяржавы залежыць, якой мы пабачым нашу краіну ў будучыні. І тут нельга заставацца абыякавым. Бо нам жыць у гэтай краіне.

У адпаведнасці з Выбарчым кодэксам у галасаванні не прымаюць удзел асобы, для якіх згодна з Крымінальна-працэсуальным кодэксам абраная такая мера стрымання, як утрыманне пад вартай. Калі падумаць, людзі, якія добраахвотна не прымаюць удзелу ў галасаванні, пазбаўляюць сябе выбарчага права і нібы ставяць сябе на адну прыступку з гэтай катэгорыяй асоб.

Выбары ў Беларусі з'яўляюцца свабоднымі. А сапраўдная свабода выяўляецца менавіта тады, калі ты сам выбіраеш, а не дазваляеш некаму выбіраць за цябе, у якім грамадстве ты будзеш жыць, выбіраць свой лёс. Твой голас патрэбен краіне.

Выбар за табой.

**Ірына ВАЙЦЯНКОВА,**
**Павел ГРЫЦЭНКА,**
**студэнты II курса юрыдычнага факультэта**

### ВЕДАЙ НАШЫХ!

## УЗНАГАРОДЫ ЗА НАВУКУ

***Два залатыя, два срэбраныя, тры бронзавыя медалі і 10 дыпломаў атрымала навукова-тэхнічная прадукцыя нашага універсітэта на VI Маскоўскім міжнародным салоне інавацый і інвестыцый, які прайшоў у расійскай сталіцы 7—10 лютага.***

На салоне было паказана больш за 70 распрацовак БДУ, у тым ліку 16 апошніх навукова-тэхнічных распрацовак. Залатымі медалямі былі адзначаны тэст-сістэмы для вызначэння сапраўднасці і якасці чырвоных вінаў і сокаў, спірометр шматфункцыянальны аўтаматызаваны МАС-1. Срэбраныя медалі атрымалі тэхналогія і абсталяванне для мікрахвалевай стэрылізацыі дыэлектрычных матэрыялаў, а таксама біярассмоктвальны антымікробны імунастымулюючы прэпарат "Аксіцэланім" для лекавання гнойна-запаленчых працэсаў любой этыялогіі і лакалізацыі.

**Паводле інфармацыі прэс-службы БДУ**




Пра поспех БДУ на VI Міжнародным салоне інавацый і інвестыцый у Маскве, дзе навукова-вытворчая прадукцыя нашага універсітэта атрымала 2 залатых, 2 срэбраных, 3 бронзавых медалі і 10 дыпломаў паведамілі інфармацыйныя агенцтвы **БЕЛТА, ІНТЭРФАКС, БелаПАН**, а таксама газеты **"Звязда"** (14.02.06); **"Рэспубліка"** (15.02.06); **"Минский курьер"** (16.02.06). Акрамя таго, пра асобныя распрацоўкі вучоных БДУ расказалі **"Экономическая газета"** (14.02.06) – "Дизельное топливо растет на полях"; **"Комсомольская правда"** (18.02.06) – "Качество сока можно проверить с помощью экспресс-теста!".

Навіну пра стварэнне "Кадравага агенцтва БДУ" з задавальненнем падхапілі СМІ краіны. Інфармацыю пра гэта распаўсюдзілі не толькі **БЕЛТА, ІНТЭРФАКС, БелаПАН**, але і расійскія Інтэрнэт-сайты **Km.ru, 5ballov.ru**, а таксама размясцілі рэспубліканскія газеты **"Звязда"** (10.02.06); **"Экономическая газета"** (10.02.06); **"Вечерний Минск"** (08.02.06), **"Знамя юности"** (17.02.06) і іншыя.

Ушанаванне лаўрэатаў Рэспубліканскага конкурсу навуковых работ студэнтаў ВНУ 2005 г., у тым ліку і студэнтаў БДУ, стала тэмай матэрыялаў рэспубліканскіх выданняў **"Народная газета"** (16.02.06), **"Настаўніцкая газета"** (16.02.06), **"Рэспубліка"** (16.02.06), **"Звязда"** (17.02.06), **"Знамя юности"** (17.02.06).

Газета **"Звязда"** змясціла 10.02.06 інтэрв'ю з дэканам эканамічнага факультэта Міхаілам Кавалёвым "Беларусь на шляху да новых тэхналогій", а 17.02.06 — інтэрв'ю з дэканам факультэта журналістыкі Сяргеем Дубовікам "Будучага ўрача можа навучыць толькі прафесійны ўрач, будучага журналіста – толькі выкладчык-журналіст".

Былі змешчаны публікацыі ў рэспубліканскіх СМІ і на іншыя тэмы.

**Агляд падрыхтаваны прэс-службай БДУ**

### АКТУАЛЬНА

## У СТУДСАВЕТА ПА ЯКАСЦІ АДУКАЦЫІ НОВЫ СТАРШЫНЯ

**Пасяджэнне студэнцкага савета па якасці адукацыі з удзелам прарэктара па вучэбна-выхаваўчай рабоце і сацыяльных пытаннях У. Суворава адбылося 10 лютага.**

Старшынёй студсавета па якасці адукацыі БДУ была абраная студэнтка III курса юрыдычнага факультэта Людміла Арлоўская.

Падчас пасяджэння студэнты выказалі свае думкі наконт работы Фундаментальнай бібліятэкі БДУ і чытальных залаў: абмеркавалі праблемы наяўнасці неабходнай літаратуры і яе даступнасць шырокаму колу чытачоў. Таксама ўздымаліся пытанні больш свабоднага доступу да Інтэрнэт-рэсурсаў на факультэтах.

Наступная сустрэча членаў савета запланавана на канец сакавіка, а да гэтага часу студэнты будуць актыўна абмяркоўваць хвалюючыя пытанні на факультэтах, каб прадставіць свае калектыўныя прапановы па ўдасканаленні гэтай працы.

**Святлана ДАЛГАНЮК**

## ПРАЦА ДЛЯ ВЫПУСКНІКА

"Кадравае агенцтва БДУ" з'явілася ў нашым універсітэце. Новае структурнае падраздзяленне створана ў адпаведнасці з далейшым развіццём мэтавых праграм "Кадры" і "Адораная моладзь", распрацаваных у БДУ. Мэта агенцтва — забяспечыць патрэбы прадпрыемстваў, ведамстваў і арганізацыяў розных формаў уласнасці ў кваліфікаваных маладых спецыялістах і дапамагчы выпускнікам БДУ ўладкавацца на працу. Працаваць кадравае агенцтва мае ў шчыльным супрацоўніцтве са структурнымі падраздзяленнямі БДУ і іншымі зацікаўленымі арганізацыямі. Спецыялісты агенцтва таксама будуць прымаць заяўкі ад прадпрыемстваў і ведамстваў на летнюю практыку студэнтаў.

У будучыні кадравае агенцтва БДУ плануе арганізаваць міжвузаўскую праграму працаўладкавання студэнтаў і выпускнікоў ВНУ Беларусі, а таксама Інтэрнэт-партал для маладых спецыялістаў. Днямі распачаў сваю працу сайт агенцтва (http://kadry-bsu.bsu.by), дзе зацікаўленыя ў пошуку працы могуць запоўніць анкету.

**Усе пытанні і прапановы можна накіроўваць непасрэдна ў кадравае агенцтва БДУ (220100, г. Мінск, вул. Кульман, 15, тэл. 293-10-89, 234-80-04) альбо дасылаць электроннай поштай (filial_bsu@bsu.by).**

### АБ'ЯВЫ

## РЭКТАРАТ БДУ

**аб'яўляе конкурс на замяшчэнне пасад:**

ЗАГАДЧЫКАЎ КАФЕДРАЎ: міжнародных эканамічных адносін, тэорыі і методыкі выкладання рускай мовы як замежнай;

ПРАФЕСАРАЎ КАФЕДРАЎ: фізічнай электронікі, міжнародных адносін;

ДАЦЭНТАЎ КАФЕДРАЎ: эканамічнай геаграфіі замежных краін, эканамічнай геаграфіі Беларусі і дзяржаў Садружнасці, нямецкай мовы, фізічнага выхавання і спорту, міжнародных адносін, сучасных замежных моў, мытнай справы, культуралогіі, сацыяльна-гуманітарных навук, усходніх моў;

СТАРШЫХ ВЫКЛАДЧЫКАЎ КАФЕДРАЎ: нямецкай мовы, фізічнага выхавання і спорту, культуралогіі, сацыяльна-гуманітарных навук, міжнароднага права;

ВЫКЛАДЧЫКАЎ КАФЕДРАЎ: дынамічнай геалогіі, фізічнай геаграфіі мацерыкоў і акіянаў і методыкі выкладання геаграфіі, геадэзіі і картаграфіі.

**Тэрмін конкурсу — адзін месяц з дня апублікавання аб'явы.**

**Адрас: 220030, г. Мінск, вул. Бабруйская, 5-а, упраўленне кадраў, тэл. 209-54-36.**

КНІЖНАЯ ПАЛІЦА

## ВЫДАДЗЕНА Ў БДУ

*Г.К. Тычко.* **Асновы літаратурна-мастацкай творчасці.** На прыкладзе твораў айчыннай і замежнай літаратур у кнізе аналізуюцца некаторыя складнікі працэсу літаратурна-мастацкай творчасці, выяўленчыя сродкі, талент. Паказваюцца прыёмы і спосабы стварэння літаратурнага тэксту.

*Л.В. Козловская.* **Социально-экономическая география Беларуси. В 3 ч. Ч. 3.** У заключнай частцы курса лекцый разглядаецца сутнасць (мэты, прынцыпы, крытэрыі) асноўных канцэпцый і схем эканоміка-геаграфічнага раяніравання Беларусі, даецца эканоміка-геаграфічная характарыстыка яе рэгіёнаў.

*Л.Л. Голубева, А.Э. Малевич, Н.Л. Щеглова.* **Компьютерная математика. Символьный пакет Mathematica.** У курсе лекцый на прыкладзе пакета Mathematica вывучаюцца пытанні ідэалогіі сімвальных пакетаў, веданне якіх дазволіць адшукваць пры неабходнасці патрэбныя сродкі для тэарэтычных даследаванняў ці рашэння канкрэтных задач.

**Вытокі гістарычнай навукі БДУ.** У зборнік навуковых артыкулаў, прысвечаных 125-годдзю з дня нараджэння акадэмікаў М.М. Нікольскага і У.М. Перцава і 70-годдзю гістарычнага факультэта, увайшлі даклады выкладчыкаў, навуковых работнікаў, аспірантаў і студэнтаў ВНУ Беларусі, Расіі, Украіны.




*В.И. Сенчило, О.И. Костюченко, В.В. Карпук.* **Фармакогнозия.** Практыкум для студэнтаў хімічнага факультэта ўключае лабараторныя работы па фітахімічных метадах выяўлення асноўных дзеючых рэчываў лекавай сыравіны, вызначэння яе сапраўднасці, дабраякаснасці і адпаведнасці патрабаванням нарматыўных дакументаў.

**Проблемы развития законодательства и правоприменительной практики.** У зборніку матэрыялаў міжнароднай навуковай канферэнцыі студэнтаў і аспірантаў, якая адбылася ў Мінску 29—30 кастрычніка 2004 г., змяшчаюцца тэзісы дакладаў і паведамленняў.

**Право и демократия. Вып. 16.** Зборнік навуковых артыкулаў знаёміць з працамі пра ролю асобы ў праве, пазітывацыю і сацыялізацыю нормаў права, фарміраванне сацыяльнай прававой дзяржавы, абарону права ўласнасці, правапрымяняльную дзейнасць суда і інш.

*А.И. Комяк.* **Молекулярная спектроскопия.** У навучальным дапаможніку падаюцца асновы спектраскапіі малекул, вынікі даследаванняў вярчальных, хістальных і электронна-хістальных спектраў малекул як у свабодным, так і кандэнсаваным стане.

**Свиридовские чтения. Вып. 2.** Зборнік артыкулаў змяшчае працы па хіміі цвердацельных макра-, мікра- і наструктураваных сістэм на аснове неарганічных рэчываў і праблемах арганізацыі навучальнага працэсу і выкладання хіміі ў вышэйшай школе.

**Проблемы развития юридической науки и совершенствования правоприменительной практики.** Зборнік навуковых прац прысвячаецца 80-годдзю заснавання юрыдычнага факультэта БДУ. Прадстаўлены навуковыя артыкулы аб прававой сістэме сучаснай Беларусі, рэалізацыі заканадаўчай, выканаўчай і судовай улад, прынцыпах узаемаадносін права і маральнасці, рэалізацыі правоў і законных інтарэсаў асобы ў крымінальным працэсе і інш.

**Упраўленне рэдакцыйна-выдавецкай работы**

ГОСЦІ

## ПРЫВІТАННЕ З АСТАНЫ

Дзве выставы, прысвечаныя беларуска-казахстанскім дачыненням, адкрыліся 20 лютага. Фотавыстава "Казахстан — XXI стагоддзе" знаёміць гледачоў з сённяшнім днём краіны. На другой выставе можна ўбачыць жывапісныя творы Маншук Алдамжаравай — жонкі Надзвычайнага і Паўнамоцнага Пасла Казахстана ў Беларусі Газіза Алдамжарава. М.Алдамжарава — не прафесійная мастачка, але малюе з дзяцінства. Яна піша нацюрморты, партрэты, пейзажы.

У цырымоніі адкрыцця выставы прынялі ўдзел рэктар БДУ прафесар Васіль Стражаў, а таксама кіраўнік дыпламатычнай місіі Казахстана ў Беларусі Г. Алдамжараў і яго жонка.

**Паводле паведамлення прэс-службы БДУ**
**Фота Генадзя КРАСКОЎСКАГА**



ВЕСТКІ З ФАКУЛЬТЭТАЎ

## БАЦЬКОЎСКІ СХОД НА ЖУРФАКУ

Незвычайнае для вышэйшых навучальных устаноў мерапрыемства прайшло на факультэце журналістыкі. Каб палепшыць вырашэнне некаторых студэнцкіх пытанняў, у актавай зале факультэта сабраліся... бацькі, што прыехалі з усёй Беларусі.

Такое мерапрыемства — навінка не толькі для факультэта журналістыкі, але і ўвогуле для БДУ. Ідэя правесці сход узнікла ў саміх бацькоў. Кіраўніцтва факультэта іх падтрымала.

Перад бацькамі выступіў дэкан факультэта С. Дубовік, намеснік дэкана па вучэбна-выхаваўчай рабоце Вольга Самусевіч, а таксама намеснік дэкана па культурна-масавай рабоце Ганна Курэйчык. Яны расказалі пра дасягненні журфака, праблемы, бліжэйшыя планы.

"Мы абавязкова зробім штогадовы бацькоўскі сход нашай традыцыяй", — запэўніў Сяргей Дубовік.

**Ірына БАЖКО**

ПРЭМ'ЕРЫ

## "ВІШНЁВЫ САД" У ЛЮТЫМ



***У тэатральным жыцці БДУ адбылася прэм'ера. 10 лютага на сцэне ліцэя БДУ студэнцкі тэатр "На балконе" паставіў чэхаўскую п'есу "Вішнёвы сад".***

Тэатр "На балконе" выйшаў на вялікую сцэну: раней спектаклі гралі ў вельмі сціплых умовах. Прычым выхад на вялікую сцэну здзейснілі адразу тры тэатральныя пакаленні. Разам з ужо вядомымі артыстамі выступілі і зусім яшчэ "зялёныя" навічкі.

"Вішнёвы сад", па словах галоўнага рэжысёра тэатра Сяргея Турбана, рэпеціравалі амаль год. І акцёрам удалося на ўсе сто ажыццявіць рэжысёрскую задумку. Новы спектакль у тэатры лічаць этапным, а следам за ім плануюць паказаць гледачам "Безграшоўе" паводле І. Тургенева і "Сляпую зорку" маладога беларускага драматурга М. Рудкоўскага.

**Марыя КАСЦЮКОВІЧ**
**Фота аўтара**

НАВІНЫ

СТУДГАРАДКА

## САМЫЯ ТАЛЕНАВІТЫЯ

***Студгарадок БДУ прыняў удзел у Фестывалі студэнцкай творчасці, які быў арганізаваны аддзелам па справах моладзі адміністрацыі Ленінскага раёна Мінска і аб'яднаў 27 тысяч студэнтаў.***

13 лютага ў Доме культуры ААТ "Элема" адбыўся фінал конкурсу. У намінацыі "Выяўленчае і дэкаратыўна-прыкладное мастацтва" перамаглі мастацкая майстэрня-студыя студэнцкага гарадка БДУ і клуб студгарадка "Мой родны кут". У размоўным жанры роўных не было студэнту факультэта прыкладной матэматыкі і інфарматыкі БДУ Яўгену Якіменку: ён заняў заслужанае першае месца. Крыху не дацягнула да "золата" група "Моцарт", якая атрымала другое месца ў намінацыі "Аўтарская песня". Былі лепшымі ў сваёй намінацыі і нашыя танцоры: першае месца заваявала студыя сучаснага танца студэнцкага гарадка БДУ "Non Stop".

**Максім КЛІМОВІЧ**

### З УСМЕШКАЙ

Падчас здачы іспытаў прафесар пытаецца ў студэнта:
— Чаму вы так хвалюецеся? Баіцеся маіх пытанняў?
— Не, прафесар! Я баюся сваіх адказаў...

***

Думкі студэнтаў каля раскладу.
I курс: "Колькі прадметаў! Шмат буду ведаць!"
II курс: "Колькі прадметаў! Буду моцна стамляцца".
III курс: "Колькі прадметаў! Які б прагуляць?"
IV курс: "Колькі прадметаў! На які б схадзіць?"
V курс бачыць, што расклад у няма і пытаецца: "А што, сесія ўжо была?"

***

Студэнт — суседу па пакоі:
— Што ты зрабіў з маёй кашуляй?
— Занёс у пральню.
— А што мне цяпер рабіць? Там на манжэтах быў запісаны ўвесь курс гісторыі!

КОРАТКА

## ДЫПЛОМЫ ЗА КНІГІ

Два дыпломы, II і III ступені, атрымала РУП "Выдавецкі цэнтр БДУ" на Рэспубліканскім конкурсе "Мастацтва кнігі", дзе дэманстраваліся працы вядучых беларускіх выдавецтваў за 2005 г. Узнагародамі адзначаны навучальны дапаможнік "Вялікая Айчынная вайна савецкага народа" ў падарункавым выкананні і атлас па геаграфіі Беларусі. Гэтыя і іншыя выданні цэнтра былі прадстаўлены на XIII Мінскай міжнароднай кніжнай выстаўцы-кірмашы "Кнігі Беларусі — 2006", якая адбылася 9—12 лютага.

**Дзмітрый СІНЯЎСКІ**

## ПРАЦОЎНАЕ ЛЕТА

Студэнты БДУ ўжо цяпер могуць запісацца ў летнія будаўнічыя атрады. У іх будзе магчымасць працаваць на рамонце інтэрнатаў, корпусаў універсітэта, будаўніцтве гасцініцы "Еўропа", удзельнічаць у сельскагаспадарчых працах. Можна таксама прыняць удзел у валанцёрскай дзейнасці: дапамога ветэранам, дапамога абітурыентам падчас прыёмнай кампаніі, шэфская дапамога дзіцячым садкам.

Больш падрабязную інфармацыю можна атрымаць у штабе працоўных спраў БДУ (начальнік Аляксандр Лянкевіч). Звяртайцеся ў каб. 205 галоўнага корпуса БДУ з 8.30 да 17.15 (тэл. 209-52-61).

**Святлана ДАЛГАНЮК**

## СТЫПЕНДЫІ ПРАФСАЮЗНЫХ ЛІДЭРАЎ




16 лютага ў Доме прафсаюзаў лідэрам прафсаюзных арганізацый былі ўручаныя стыпендыі ад Беларускага прафесійнага саюза работнікаў адукацыі і навукі. Сярод іншых атрымала стыпендыю і студэнтка IV курса філалагічнага факультэта БДУ Таццяна Касцюкевіч. Таццяна ўзначальвае адну з самых вялікіх факультэцкіх прафсаюзных арганізацый, дзе колькасць членаў прафсаюза складае амаль 90 %.

**Сняжана ЛІСОЎСКАЯ**
**Фота Юліі ПАПОВАЙ**

## ДАБРАЧЫННАЯ АКЦЫЯ

Па ініцыятыве Саюза жанчын БДУ і пры дапамозе прафсаюзнага камітэта студэнтаў БДУ сярод навучэнцаў нашага універсітэта, якім патрэбна сацыяльная падтрымка (інвалідам і сіротам), была размеркавана гуманітарная дапамога ад нямецкай міжнароднай гуманітарнай недзяржаўнай арганізацыі "Чарнобыльская дапамога" ("Chernobyl help"). У якасці гуманітарнай дапамогі былі атрыманы 17 пасылак па 20 кг кожная з харчовымі прадуктамі (кавай, цукрам, супамі, мукой, мюслямі, какавай, шакаладам, локшынамі, гарбатай, крупамі) і адзеннем.

**Сняжана ЛІСОЎСКАЯ**

УНІВЕРСІТЭТ
Выдаецца з 1929 года

Заснавальнік газеты – Беларускі дзяржаўны універсітэт
Газета ўзнагароджана Ганаровай граматай Вярхоўнага Савета БССР

Газета зарэгістравана Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.
Рэгістрацыйнае пасведчанне №149 ад 30 жніўня 2005 года

23 лютага 2006 года
Падпісана да друку 22.02.2006 г.
Зак.147. Тыраж 1000 экз. Ум. друк. арк. 1
Надрукавана ў РУП "Выдавецкі цэнтр БДУ"
ЛП № 02330/0056850 ад 30.04.2004.
220030, г. Мінск, вул. Чырвонаармейская, 6

Рэдактар Таццяна КАЗАК
Камп'ютарная вёрстка Аляксандра Саламахіна
Адрас рэдакцыі: 220030, Мінск, праcп. Незалежнасці, 4
Прыёмная рэдакцыі: вул. Бабруйская, 7, пакой 411, тэлефон 209-53-45,
e-mail: Gazeta@bsu.by; www.gazeta.bsu.by